## ЗАГЛЯНЕМ У ЛАБАРАТОРЫІ



3. Што не кажыце, а ўдваіх куды лягчэй праводзіць лабараторную работу. Праўда, Леанід Пухцілаў узяў на сябе больш адказны ўчастак—зняцце вольтамерных характарыстык паўправаднікоў. А Ніне Лоскутавай даверыў толькі іх запіс. Аднак і тут лепш за ўсё прытрымлівацца прымаўкі: сем раз адмерай—адзін раз адрэж.

КНІЖНАЯ ПАЛІЦА

# З гісторыі друку БССР

Выдавецтва універсітэта выпусціла зборнік артыкулаў «З гісторыі партыйна-савецкага друку Беларусі». Аўтары зборніка—выкладчыкі аддзялення журналістыкі нашага універсітэта М. С. Зярніцкі, Р. В. Булацкі, В. І. Дубовік, А. І. Апялінская і інш. зрабілі першую спробу асвяціць асноўныя этапы развіцця перыядычнага друку рэспублікі за 40 год.

Артыкулы, апублікаваныя ў зборніку, напісаны на аснове вывучэння камплектаў газет, часопісаў, архіўных матэрыялаў. У іх выкарыстана многа новых, мала вядомых да апошняга часу даных аб дзейнасці друку Беларускай ССР.

У зборніку асвятляецца дзейнасць беларускага савецкага друку ў першыя гады савецкай улады, а таксама ў наступныя гады сацыялістычнага будаўніцтва.

Спецыяльны артыкул прысвячаецца партызанскаму друку Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Асвятляецца дзейнасць беларускага рэспубліканскага друку ў пасляваенны перыяд.

Гэтая кніга з'яўляецца каштоўным дапаможнікам для работнікаў друку БССР і студэнтаў аддзялення журналістыкі, якія вывучаюць гісторыю беларускага рэспубліканскага друку.

**В. КАВАЛЬКОЎ.**

# СПЫТАЙ У КНІГАРНІ

Выдавецтва Акадэміі навук БССР выпусціла ў свет новыя наступныя кнігі:

**Беларусь у эпоху феадалізма. Зборнік дакументаў і матэрыялаў у трох тамах.** Том II. 560 стар. Цана 10 руб. 70 кап. На рускай мове.

**Беларускае мастацтва.** Зборнік артыкулаў і матэрыялаў, вып. II. 220 стар. Цана 12 руб. На беларускай мове.

**Ю. С. Пшыркоў. Беларуская савецкая проза.** 344 стар. Цана 8 руб. На беларускай мове.

**Пытанні крымінальнага і грамадзянскага права ў новым заканадаўстве.** 260 стар. Цана 4 руб. 80 кап. На рускай мове.

**М. С. Долбік. Драпежныя птушкі і іх распазнаванне ў прыродзе.** 50 стар. Цана 1 руб. На рускай мове.

# САМАЕ, САМАЕ...

*Самая маленькая птушка на зямлі — жыхар Амерыкі, адзін з відаў калібры. Памерам яна са шмяля і важыць менш двух грам. Гэта малютка з'яўляецца ў многіх адносінах сапраўднай рэкардсменкай. У яе самыя маленькія яйкі, памерам менш гарошыны, якія важаць каля паўграма У яе самыя рухавыя крыллі, дзякуючы якім яна можа, не паварочваючы цела, лятаць уверх, уніз, назад, уперад і спыняцца ў паветры на адным месцы, высасываючы пры гэтым нектар у кветак. У яе самая высокая тэмпература цела—і самае моцнае сэрца з усіх пярнатых.*

*Самы першы чай, «трава багоў», як яго тады называлі, быў завезены ў Еўропу з вострава Явы галандскімі купцамі ў 1610 годзе. Каб павысіць цану на чай, купцы ўсяляк расхвальвалі яго і прыпісвалі лекавыя ўласцівасці. Яны рэкамендавалі хворым піць чай днём і ноччу па сорак—пяцьдзесят шклянак у суткі.*

*Самай вялікай кветкай з'яўляецца рафлезія, якая расце ў лясах Суматры. Яна мае ў папярэчніку метр і важыць дзесяць кілаграмаў. Кветаножка яе такая кароткая, што рафлезія літаральна сядзіць на зямлі. Адшукаць гэтую кветку ў лесе можна па паху, які напамінае пах гнілога мяса. Не вельмі прыемны водыр, які прыцягвае толькі цэлыя раі мух! Цікава, што гэта кветка-гігант вырастае з вельмі маленькага семя, якое ледзь бачна няўзброеным вокам.*

*Самое кароткае ў свеце кветак жыццё—у кветкі амерыканскага лотаса. Яе кволыя жоўтыя кветкі распускаюцца на світанні, але праз поўгадзіны вянуць. Самы працяглы час жыве кветка трапічнай архідэі, якая красуе 80 дзён.*




# ЖРАЦЫ БАХУСА

ФЕЛЬЕТОН

*П'юць людзі з прычыны і без прычыны. П'юць з-за таго, што сто год назад памёр вялікі хімік. П'юць нават таму, што наступіла першая на гэтым тыдні субота. І нарэшце, п'юць дзеля таго, «каб мы пілі-пілі не ў апошні раз».*

*Іменна так пачалі вялікі бурсацкі запой малодшы навуковы супрацоўнік хімфака Іван Фёдаравіч Кананюк і выкладчык гэтага ж факультэта Георгі Іванавіч Самаль, якія жывуць у пакоі № 22 у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова.*

*У суботу вучоныя мужы пілі кан'як. Закусвалі лімончыкам. У нядзелю пілі «маскоўскую асобую». Закусвалі каўбаскай кракаўскай. У панядзелак пілі спірт звычайны, змешаны дзеля крэпасці з півам жыгулёўскім. Нічым не закусвалі—грошай не хапіла. Кампанія складалася з двух палавін, мужчынскай і жаночай. Суму месца не было. Калі надакучала піць, пачыналі пець. Старанна выводзілі асіплымі галасамі народную запойную «Шумел камыш, деревья гнулись...» Потым перайшлі на Бетховенскую «Застольную»: «Налей! Вып'ем дальбог жа яшчэ».*

*Трымцела шкло ў вокнах, трымцелі пустыя бутэлькі пад сталом, дрыжэлі сцены ў пакоі. Калі хлопцы згубілі галасы, перайшлі да танцаў. Што танцавалі—невядома, ці той рок-н-рол, ці больш модны хула-хуп, але гул быў. Ды такі, што суседзі, выкладчык Павел Паўлавіч Сіліванчык і загадчык мінералагічнага музея Уладзімір Георгіевіч Спірыдонаў не змаглі вытрымаць—а першай гадзіне ночы разам з прадстаўнікамі студкома прыйшлі супакойваць разгуляўшыхся малайцоў.*

*Дзівосны малюнак адкрыўся ім: танцавалі толькі дзяўчаты. За недахопам плошчы адзін з гасцей у белым модным гальштуку закінуў капыты на капу і грукаў імі па сценцы. Другі, стаўшы на калені, раз-по-раз усклікаў:*

*—Давай зліемся у экстазе!*

*Трэці стукаў сабе ў грудзі і плаксіва прасіў:*

*—Я кісель, капітан-аспірант. Дайце хоць каму-небудзь у лыч суну.*

*Георгі Іванавіч, дзынкаючы фужэрамі, млосна мармытаў нешта і зліваў апіўкі ў сваю шклянку. Кульнуў. Крыктануў. Закусіў рукавом. Ікнуў і ветліва звярнуўся да Сіліванчыка:*

*—Глядзі, браток штурхну незнарок—застанецца жонка ўдавой.*

*Капітан-аспірант паспрабаваў падняцца, але зноў грузна асеў на ложак і знясілена параіў:*

*—Дай яму пендаля, ліха яго матары!*

*Пагроза не ўзымела дзеяння. Капітан-аспірант прыйшоў у лютасць. Тыцнуўшы пальцам у грудзі Паўла Паўлавіча, уладарна загадаў:*

*—Рас-сстраляць!*

*Жаночая палова кінулася да дзвярэй. Самаль рагатаў, аж за жывот браўся. Іван Фёдаравіч прыняў баксёрскую стойку, але не ўтрымаўся і бразнуўся на падлогу. Капітан-аспірант з нечаканай крыўдай паведаміў:*

*—Я больш з імі спяваць не буду. Хай адны спяваюць. Жора, дружа, давай збацаем стылем!*

*І раптам учапіўся за руку Паўла Паўлавіча, спытаў падазрона:*

*—А ты хто будзеш? Студэнт? Люблю студэнтаў. Калі не прыдзеш да іх, чайнік з вадой і скарынка хлеба ёсць. А піць пачнуць, зямля дрыжыць. Жрацы Бахуса! Во! Ведаеш, бог такі быў у старажытных грэкаў. Э, ды што ты ў гэтым разумееш, блазнюк!—зняважліва махнуў рукой.*

*Зноў працяжна ікнуў і гасцінна прапанаваў:*

*—А хочаш, у морду дам.*

*І тут жа пакрыўдзіўся, звярнуўся да Самаля:*

*—Ён думае, што мы не вучоныя. Ды хто гэта сказаў? Мы, Жора, кніжкі вагонамі чытаем. А спірт п'ем—цыстэрнамі!*

*Самаль па-напалеонаўску склаў рукі на грудзях, адчыніў дзверы і зычна загадаў:*

*—А ну, шкалдыбай адсюль, пакуль цэлы!*

*І сакавіта са смакам вылаяўся. Жрацы Бахуса аж да трох гадзін ночы аддавалі даніну богу п'янства і распусты.*

**А. ШЛЕГ.**
**А. БАЛАШ.**

# Работу сталовай— пад грамадскі кантроль

Студэнты універсітэта, якія жывуць у інтэрнаце па вуліцы Дзімітрава, спадзяваліся, што адкрыццё доўгачаканай сталовай прынясе ім палёгку ў паўсядзённым жыцці. На абсталяванне сталовай выдаткаваны дзесяткі тысяч рублёў. Устаноўлены дарага каштуючыя халадзільнікі, электраплiткі, буфеты. Здавалася, нішто не павінна перашкаджаць нармальнай рабоце сталовай. Тут жа створаны ўсе магчымасці гатаваць ежу смачна і танна. Усё залежала ад людзей, якія пастаўлены на гэты участак работы.

Але з першых дзён работы сталовай быццам знарок усё робіцца для таго, каб студэнты не паміналі яе добрым словам. Гатуюць нясмачна, вельмі абмежаван асартымент страў. Усе яны параўнаўча дорага каштуюць.

Мы вырашылі праверыць абгрунтаванасць скаргаў студэнтаў. А трэба зазначыць, што ні адзін чалавек не адазваўся станоўча аб рабоце сталовай. Студэнт першага курса юрфака Беленькі заявіў, што яму падалі пракісшы суп-лапшу. Гэта ж пацвердзіў яго аднакурснік Міранічэнка. Яны паскардзіліся на тое, што хлеб на сталах заўсёды чэрствы. І Беленькі, і Міранічэнка заявілі, што зараз студэнты амаль не ходзяць сюды абедаць. Сталовая працуе нерэнтабельна. Так здарылася таму, што яе калектыў не заваяваў аўтарытэта сярод студэнтаў. Апошнія на цэлы кіламетр абыходзяць гэтую ўстанову. Між іншым пры ўмелай арганізацыі работы можна выканаць план тавараабароту—у інтэрнаце ж жыве больш тысячы чалавек. Справа ў іншым. Калі грамадскія кантралёры праверылі выхад прадуктаў, яны знайшлі недавес у порцыях масла, селядца, супа. Яны выявілі бруд на кухні, сапсаваныя і гнілыя прадукты, з якіх повары гатавалі ежу.

Трэба кінуць папрок у адрас прафкома універсітэта і яго бытавога сектара, які выпусціў работу сталовай з-пад свайго кантролю. Пры паўсядзённай праверцы стану спраў ў апошняй, там, напэўна, не было б такіх недахопаў.

Патрэбна рашыць яшчэ адно пытанне. Сталовая працуе з 14 да 21 гадзіны. А што павінны рабіць студэнты, якія ідуць на заняткі да 9 гадзін раніцы? Дзе яны змогуць паснедаць? Дзе павінны харчавацца студэнты, якія займаюцца ў другую змену? Гэтым пытаннем ніхто не займаўся. А можна было б арганізаваць буфет, які забяспечыў бы студэнтаў малаком, кефірам, чаем, булачкамі і інш.

Вельмі многа спраў чакае свайго вырашэння з арганізацыяй харчавання студэнтаў. Думаем, што не апошняя роля ў гэтым адведзена грамадскім арганізацыям універсітэта.

**ДУЛЕБА,**
**студэнт III курса юрфака, член партбюро факультэта.**

**ДЗЯМІДАЎ,**
**грамадскі кантралёр.**



Па ініцыятыве савета ленпакоя інтэрната па вул. Свярдлова сярод яго жыхароў пачаўся шахматны турнір.
На здымку: момант спаборніцтваў.

Фота В. АНЦЫФЕРАВА.

**Калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта выказвае глыбокае спачуванне загадчыцы аддзела аспірантуры Ніне Паўлаўне ПРАТАСЕВІЧ з выпадку напаткаўшага яе гора—заўчаснай смерці мужа УЛАДЗІМІРА ІГНАЦЬЕВІЧА.**

**Рэдактар М. ЦІКОЦКІ.**

НАШ АДРАС:
**Мінск,
Універсітэцкі гарадок,
біякорпус, 31;
Тэлефон: 2-07-19.**

**Друкарня выдавецтва БДУ імя Ул. І. Леніна.**

АТ 11884. Зак. 2133.